# ПОМНІК СТАРАБЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА “АПОВЕСЦЬ ЖЫЦЦЯ І СМЕРЦІ ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ” І ТРАДЫЦЫІ ВІЗАНТЫЙСКАЙ І СТАРАЖЫТНАРУСКАЙ АГІЯГРАФІЧНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Борбат Таццяна Іванаўна**
дацэнт кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый
установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

**Чмарава Марына Іванаўна**
дацэнт кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый
установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

Актуальнасць дадзенай тэмы нязменна расце з цікавасцю да гендэрнай праблематыкі ў гуманітарных даследаваннях, у айчыннай і замежнай навуцы. Разгляд рэлігійнай сферы як адной з галін сацыяльнай рэалізацыі жанчын



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

можа даць пэўнае ўяўленне аб сацыяльнай ролі жанчыны ў Кіеўскай Русі, тагачасным грамадстве, пра змест жаночых ідэалаў у культурна-гістарычным кантэксце тагачаснай эпохі.

Зварот да асобы Ефрасінні Полацкай (Прадславы) (каля 1104–1167) звязаны з тымі зменамі, якія адбываюцца ў нашай дзяржаве і грамадстве ў дачыненні да рэлігіі. Гэтыя змены прыводзяць да адраджэння ў грамадскай свядомасці цікавасці да духоўна-рэлігійнай традыцыі, да яе вытокаў і бытавання. Вывучэнне феномену святасці ў кантэксце культуры дазваляе зразумець сістэму каштоўнасцяў, маральна-этычныя арыенціры і духоўныя запыты грамадства ў пэўныя гістарычныя перыяды.

У Полацкай зямлі царкоўнае шанаванне Ефрасінні Полацкай пачалося ўжо ў канцы XII стагоддзя (ужо тады існавала царкоўная служба прападобнай Еўфрасінні Полацкай і агіяграфічны твор). Аднак царкоўнае шанаванне да XVI стагоддзя мела толькі мясцовы характар і ў Маскоўскай Русі імя Ефрасінні Полацкай было амаль невядомым. Агульная служба святой была зацверджана Рускай Праваслаўнай Царквою параўнальна нядаўна – толькі ў 1893 годзе. Гэта магло быць звязана з тым, што, з аднаго боку, Кіеўская Русь была вельмі зацікаўлена ў кананізацыі і праслаўленні сваіх нацыянальных святых, паколькі, прыняўшы хрысціянства ад Візантыі, яна вымушана была адстойваць сваю духоўную, ідэалагічную і прававую самастойнасць, а з другога – Візантыя ўсяляк імкнулась перашкаджаць руху правінцыйных цэркваў да незалежнасці і раўніва адносілася да стварэння мясцовых культаў, паколько лічылася, што гэта можа мець тэндэнцыю да адступлення ад дагматычных асноў хрысціянскага веравучэння. Кананічная практыка была абмежавана жорсткімі правіламі і строга цэнтралізавана: афіцыйна святы мог шанавацца толькі пасля ухвалення канстанцінопальскага патрыярха. Патрыярхі, як і кіеўскія мітрапаліты – грэкі, усяляк стрымлівалі рэлігійны нацыяналізм новахрышчонага народа. Але, разам з тым, факт кананізацыі Барыса і Глеба, напрыклад, а троху пазней Феадосія Пячэрскага,сведчыў аб прызнанні Візантыяй ваеннай і палітычнай моцы рускай дзяржавы, высокага прызвання Рускай царквы.

У наш час прынятае шанаванне Ефрасінні як «заступніцы Беларусі» і «асветніцы Беларусі». Асветніцкая дзейнасць Ефрасінні магла мець не цалкам кананічны характар, а яе царкоўная дзейнасць магла быць скіраванай, на грунце яе высокага паходжання, у абыход царкоўнай іерархіі, на павышэнне самастойнасці Полацка ў царкоўных справах. Мяркуецца, што гэта магло быць прычынай канфліктаў між Ефрасінняй і царкоўнымі ўладамі, і паслужыла сапраўднай прычынай таго, што астанкі Ефрасінні былі пакінуты ў Кіеве, а не вярталіся ў Полацк[5 ].

Мясцовае шанаванне Ефрасінні Полацкай узыходзіць да XVI ст. Тэксты іканапісных арыгіналаў лаканічныя: «Акі Еўдакія». Паясная выява прападоб-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

най на іконе «Рускія святыя» (1814) знаходзіцца ў адным шэрагу з Ефрасінняй Суздальскай. Толькі ў пачатку XX стагоддзя старажытнаруская князёўна і ігумення, заснавальніца двух манастыроў у Полацку, атрымала сапраўдную славу.

Цікавым з'яўляецца, на наш погляд, вызначэнне ўнікальнасць асобы Прадславы (Ефрасінні Полацкай) у кантэксце феномена святасці візантыйскай і старажытнарускай агіяграфічнай традыцыі.

Першыя ўсходнеславянскія жыції складваліся ў відавочнай залежнасці ад найбольш старажытных узораў візантыйскай агіяграфіі. Да таго часу ўсходнееўрапейская агіяграфічная літаратура ўжо мела шматвякавую традыцыю, выпрацавала свае дакладныя жанравыя формы і паэтыка-стылёвыя сродкі. Старажытнарускія кніжнікі набылі ў ранневізантыйскіх жыціях найвышэйшыя ўзоры духоўна-рэлігійнай героікі, ужо сфарміраваны ідэал святасці. У адрозненні ад візантыйскіх узораў старажытнаруская агіяграфія, асабліва яе ранняга перыяду мела выразныя стылёвыя прыкметы жанра летапіснага апавядання. Сюжэтныя сітуацыі ў ранніх рускіх жыціях насычаны нацыянальна-гістарычнымі і бытавымі рэаліямі, звязаныя з хрысціянізацыяй Русі, манастырскім будаўніцтвам, княжаскімі ўсобіцамі, асваеннем новых зямель. Нацыянальнае асаблівасць агіяграфіі Кіеўскай Русі праявілася і ў спецыфіцы старажытнарускага разумення героікі рэлігійнага падзвіжніцтва. Так, калі візантыйскія манастырскія ўставы прапаноўвалі перш за ўсё шляхі асабістага выратавання, то старажытнаруская манашаская практыка адрознівалася большым падзвіжніцтвам ў імя грамадства. Прадвызначэнне рэлігійнага подзвігу ў Старажытнай Русі асацыірвалася са служэннем Богу праз служэнне бліжняму, свету, Радзіме, у тым ліку праз ваенныя подзвігі ў імя незалежнасці краіны. Рэлігійны подзівіг ўключаў таксама барацьбу падзвіжніка з язвамі і парокамі паўсядзённага жыцця, адмоўных бытавых з'яў. У гэтым героі старажытнарускай агіяграфічнай літаратуры былі больш актыўныя, дзейсныя, энергічныя, чым героі перакладных агіяграфічных твораў.

На фоне гэтых асаблівасцяў вылучаецца ўнікальнасць асобы і адметнасць дзейнасці Ефрасіні Полацкай, вобраз святой жанчыны ў "Аповесці жыцця і смерці Ефрасінні Полацкай"[1]. Ён выразней праяўляецца і ў кантэксце візантыйскай агіяграфічннай літаратуры (IX–XII стст.), дзе руская даследчыца І. Ахлупіна выдзяляе чатыры тыпы святых жанчын:

1) цнатлівая манахіня;

2) удава, якая прыняла пострыг;

---

[1] "Аповесць жыцця і смерці Еўфрасінні Полацкай" – унікальны помнік гатычнага пісьменства сярэднявечнай Беларусі, створаны ў XII стагоддзі. "Аповесць жыцця і смерці Еўфрасінні Полацкай" дайшла да нашага часу ў больш як 100 спісах XIV–XVIII стст, а таксама шматлікіх страдруках. Найбольшую каштоўнасць у тэксталагічным і літаратуразнаўчым аспектах мае Пагодзінскі спіс.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) набожная міранка;

4) імперыятрыца [1].

Спярша вобраз святой аж да IX стагоддзя ў Візантыі быў звязаны з адрачэннем ад свету, якое дасягалася праз аскетычныя, практычныя цноты, пакуты плоці і руплівай працы дзеля дабрачыннасці. У IX стагоддзі ў Візантыі назіраюцца адступленні ад канону апісання жаночай святасці, у прыватнасці, узвядзенне ў ранг святасці жанчын, якія пабывалі ў шлюбе – законных удоў. Назіраецца высвятленне значнасці празмернага аскетызму. У агіяграфіі X стагоддзя сталі праслаўляцца святыя жанчыны, якія не прымалі пострыг і ў свеце дасягнулі святасці. Галоўнымі якасцямі святой міранкі, якія вызначалі яе святасць, становяцца міласэрнасць, пакора, цярпенне, дабрачыннасць і шлюбная вернасць.

У "Сачыненнях святых Айцоў царквы" – Іаана Дамаскіна, Васіля Вялікага, Іаана Златавуста і іншых прадстаўлены дзве мадэлі жаночых паводзінаў: дзевы-манахіні і жонкі-маці. У вучэннях айцоў царквы сцвярджалася, што ідэальныя паводзіны дзевы прадугледжвалі ўсмірэнне плоцкіх жаданняў суровасцю жыцця. Ідэал аскетычнага пазашлюбнага жыцця быў успрыняты многімі святымі жанчынамі як мадэль удасканалення і адзін з шляхоў да Бога. Ідэі айцоў царквы аб ідэалах жаночых паводзінаў разглядаліся візантыйцамі ў якасці рэлігійнай ісціны, уплывалі на ўспрыняцце і інтэрпрэтацыі аўтарамі жыцій характарыстык святасці ў жаночым целе. Менавіта гэтыя мадэлі жаночых паводзінаў былі запазычаны візантыйскай агіяграфічнай літаратурай на працягу VIII–XIII стагоддзяў. Вобраз цнатлівай манахіні ўяўляў сабой універсальны тып святасці, які існаваў у візантыйскай агіяграфіі ўжо ў VIII па XI стагоддзе. Такім чынам, вобраз святой Ефрасінні Полацкай паводле гэтых характарыстык можна далучыць якраз да першага тыпу святасці (адлучэннем ад свецкага жыцця, якое дасягалася праз аскетызм, цноты, пакуты цела і ўпартай працы дзеля дабрачыннасці). "Чаго дасягнулі продкі мае? Ажаніліся, выходзілі замуж, княжылі, але не вечна. І жыццё іх – міма працякло. Слава іхняя – згінула, нібы прах, горай за павуціну. У той жа час былі жанчыны, якія ўзброіліся мужчынаскай трываласцю і пайшлі ўслед за жаніхом сваім – Хрыстом. Яны аддалі целы свае для ранаў, а галовы – для мячоў <...> " [с. 75]. Дзейнасць Ефрасінні Полацкай, яе княжаскае паходжанне, спецыфічныя рысы характару дазволілі ёй даволі актыўна весці не толькі рэлігійную, дабрачынную дзейнасць, але і асветніцкую, палітычную, скіраваную і на ўмацаванне ўлады полацкіх князёў, Полацкага княства. Тут варта прыгадаць непасрэдныя кантакты Ефрасінні з Царградам, асабістыя сустрэчы з царом Мануілам і Канстантынопальскім патрыярхам Лукой, пра што сведчыць агіяграфічны твор. З імем Ефрасінні звязваецца набыццё Полацкім Сафійскім саборам абраза Багародзіцы Эфескай. На той час існавалі толькі тры такія

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

абразы і лічылася, што пры жыцці Дзевы Марыі гэтыя абразы намаляваў апостал Лука. Ефрасіння паслала слугу Міхаіла да візантыйскага імператара Мануіла І Камніна і патрыярха Лукі Хрысаверга ў Канстанцінопаль па ікону святой Эфескай Багародзіцы для Багародзіцкага манастыра. Многіх гісторыкаў (у прыватнасці Д. Нікалаюка) здзіўляе тое, што пасольства было выпраўлена не полацкім епіскапам, а самой ігуменняй, і яны мяркуюць, што ў XII ст. вышэйшая царкоўная, а часткова і свецкая ўлада належала настаяцельніцы полацкіх манастыроў. Нарэшце, крыж, які зрабіў Лазар Богша па яе просьбе, таксама быў актам замацавання легітымнасці княжацкага роду Рагвалодаў праз валоданне пэўным хрысціянскім артэфактам.

Відавочна, што вобраз Ефрасінні Полацкай, які адлюстраваны ў "Аповесці жыцця і смерці Ефрасінні Полацкай" можна аднесці да тыпу святых дзеў-манахінь. Аднак яе ахвярная, спадвіжніцкая дзейнасць на працягу жыцця выходзіць за гэтыя рамкі. Вобраз Святой Ефрасінні Полацкай не звязаны выключна з тым ідэалам святасці, які прадугледжваў поўны адыход ад свецкага жыцця і адмаўлення ад сямейных повязяў. Ефрасіння Полацкая заўсёды памятавала пра свой род, умацоўвала яго магутнасць і менавіта адтуль шукала сабе паплечніц і наступніц (сёстры і пляменніцы пад уздзеяннем Еўфрасінні Полацкай таксама прынялі пострыг).

"Якімі словамі, браце, належыць нам ушанаваць светлазорную памяць дабраславёнай нявесты Хрыстовай – Ефрасінні! Мелі памочніка – пакрыўджаным, суцяшальніка – смуткуючым, адзенне – распранутым, наведніка – хворым, прастору – для ўсіх! Паўсюль была Ефрасіння, бо сэрца сваё напоўніла Божай прамудрасцю! Еўфрасіння – вечная кветка райскага саду! Ефрасіння – небасяжны арол, што сягнуў ад Заходу да Ўсходу! Нібы месяц сонечны, прасвятліла ўсю зямлю Полацкую! Хваліцца Селун сваім Дзімітрыем, а Вышгарад – пакутнікамі. А мы хвалім, дабраславёны ты, горад Полацк, што ўзгадаваў гэтакі парастак – Ефрасінню!" [6, с. 86].

Тэкст помніка "Аповесць жыцця і смерці Ефрасінні Полацкай" пабудаваны згодна канонам агіяграфічная літаратуры, а адным з узораў магло служыць "Жыціе Ефрасінні Александрыйскай"[1] у гонар якой і далі Прадславе

[1] Ефрасіння Александрыйская – (месца нараджэння Александрыя, Егіпет – дата смерці каля 470, Александрыя, Егіпет), хрысціянская святая, якая жыла ў манастыры пад відам мужчыны. Шануецца ў ліку прападобных, памяць ушаноўваецца ў Праваслаўнай царкве 15 лютага і 25 верасня, у Каталіцкай царкве – 1 студзеня і 11 лютага. Жыціе сведчыць, што прападобная Ефрасіння нарадзілася ў пачатку V стагоддзя ў горадзе Александрыі ў сям'і знатных і заможных бацькоў і была адзіным дзіцём. Маці Ефрасінні памерла рана. Выхоўваў дачку бацька, Пафнуцій, які быў глыбока веруючым чалавекам, благачасцівым хрысціянінам. Ён часта наведваў манастыр, ігумен якога быў яго духоўным настаўнікам. Калі Ефрасінні споўнілася 18 год, бацька хацеў выдаць дачку замуж. Ён накіраваўся ў манастыр да свайго настаўніка, каб атрымаць благаславенне на шлюб сваёй дачкі. Ігумен гутарыў з дзяўчынай і даў ёй сваё благаславенне, але святая Ефрасіння імкнулася да манашаскага жыцця. Прыняўшы тайна пострыг, яна пакінула бацькоўскі дом і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

імя Ефрасіння пасля пострыгу. Ефрасіння Александрыйская разам з Георгіям Пабеданосцам і Святой Сафіяй была пакравіцелькай Ефрасінні Полацкай. Аскетычны подзвіг служэння Богу непарыўна звязваецца ў творы з жыццёвым подзвігам – служэнне народу. У гэтым таксама заключаецца і сцверджанне актыўнай пазіцыі чалавечай асобы, жанчыны, пераасэнсаванне яе сацыяльнай ролі, новая ацэнка яе творчых магчымасцей і духоўнага патэнцыялу, што было вынікам не толькі спецыфікай аўтарскага дэмакратызму і гуманізму, але і зменамі ў развіцці грамадства і рэлігійных адносінаў. Актыўная пропаведзь адукацыі, пісьменства, агульначалавечай маралі і самаахвярнасці у служэнні хрысціянскай ідэі спалучаюцца ў творы з не менш выразным матывам – услаўленнем Ефрасінні як патронкі роднага краю, які не абмінула Божая ласка.

### Літаратура


1. *Охлупина, И. С.* Образы святых женщин в Византии VII–XII веков: становление, эволюция, типология : диссертация кандидата исторических наук: 07.00.03. / Охлупина Ирина Сергеевна; [Место защиты: Ур. федеральный университет имени Первого Президента России Б. Н. Ельцина]. – Екатеринбург, 2011. – 283 с. Ил. РГБОД, 61 12 7 /30.
2. *Охлупина, И. С.* Образы матерей в византийской агиографии / И. С. Охлупина // Известия Уральского федерального университета. Серия 2. Гуманитарные науки. – 2013. – № 3. – С. 54–67.
3. *Марціновіч, А.* Святая Еўрасіння або Адкуль ёсць, пайшла Полацкая зямля. -- Мн. : Беларусь, 2009. – С. 70.
4. *Мельнікаў, А.* «Жыціе» і жыціё Еўфрасінні, ігуменні Полацкай. Адраджэнне : гіст. альманах. Вып. 1 / склад. і навук. рэд. А. П. Грыцкевіч. – Мн. : Універсітэцкае, 1995. – 259 с. : іл.
5. *Гаранін, С. Л.* Еўфрасіння Полацкая і епіскап Ілля: Гісторыя стасункаў і прычына канфлікту [2002] // Мельнікаў А. А. З неапублікаванай спадчыны : манаграфіі, артыкулы, вершы, матэрыялы навуковай канферэнцыі, успаміны сучаснікаў / Аляксей Мельнікаў. – Мн. : Чатыры чвэрці, 2005. – 592 с.
6. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / уклад., прадм., камент. І. Саверчанкі. – Мн. : Кнігазбор, 2007. – 608 с.
7. *Федотов , Г. П.* Святые Древней Руси / Г. П. Федотов. – М., 1990.
8. *Дёмин, А. С.* Художественные миры русской литературы / А. С. Дёмин. – Москва, 1993.


---

вырашыла паступіць у абіцель, каб правесці жыццё у адзіноце і малітве. Баючыся, аднак, што ў жаночым манастыры яе знойдзе бацька, яна, назваўшы сябе еўнухам, Ізмарагдам, прыйшла ў той самы мужской манастыр, які з дзяцінства наведвала разам з бацькам. Манахі не пазналі пераапранутую ў мужское адзенне Ефрасінню і прынялі ў сваю абіцель. У келлі ў працах, пасце і малітве святая Ефрасіння правяла 38 год і дасягнула высокага духоўнага ўдасканалення. Яе бацька сумаваў па страце любімай дачкі і не раз гутарыў з манахам Ізмарагдам, адкрываючы яму свой сум, і знаходзіў у яго духоўнае суцяшэнне. Перад канчынай праподобная Ефрасіння адкрыла свайму бацьку тайну і прасіла, каб ніхто, акрамя яго, не рыхтаваў да пагрэбення яе цела. Пахаваўшы дачку, Пафнуцій аддаў усю сваю маёмасць жабракам і манастыру і прыняў манашаства. Дзесяць год да самай смерці ён пражыў у келлі сваёй дачкі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова